ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 18 (1287) | СУБОТА, 24-га студзеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80
1 год . . . 3 р. 30
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Камсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага № 2 кап.

ЦКК КП(б)Б выключыла з шэрагаў КП(б)Б У. Ігнатоўскага і З. Жылуновіча

Савецкай грамадзкасьці даўно вядома нацыянал-дэмакратычная дзейнасьць б. прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук У. Ігнатоўскага і літаратара З. Жылуновіча (Ц. Гартнага), які займаў шэраг адказных пастоў.

Справа Ігнатоўскага і Жылуновіча гэтымі днямі была разгледзена прэзыдыумам і партколегіяй ЦКК КП(б)Б.

Ігнатоўскі У. М. і Жылуновіч З. (Ц. Гартны) выключаны з шэрагаў КП(б)Б.

Матэр'ялы па справе Ігнатоўскага і Жылуновіча будуць зьмешчаны ў заўтрашнім № „Ч. З.“

НА ФОНЕ РАСТУЧАГА СУСЬВЕТНАГА КРЫЗІСУ—

СССР пасьпяхова заканчвае кладку фундаманту соцыялістычнай экономікі

Міжнароднае і ўнутранае становішча і задачы комсамолу

Даклад тав. Кагановіча на IX-ым зьезьдзе ЎсеЛКСМ*)

Таварышы, мінулыя з моманту VIII зьезду комсамолу два з паловай гады былі рашаючымі гадамі для посьпеху справы Кастрычнікавай рэволюцыі, справы, за якую змагаліся і гінулі на працягу дзесяцігодзьдзяў сотні тысяч людзей, лепшых людзей рабочае клясы.

Ленін ня раз падкрэсьліваў, што мала прапаведваць і весьці клясавую барацьбу,—патрэбна давесьці ідэю клясавай барацьбы да канца, г. зн. да перамогі дыктатуры пролетарыяту. Мала заваяваць дыктатуру пролетарыяту, мала ліквідаваць клясу абшарнікаў і буйных капіталістых,—трэба здолець выкарчаваць карэньні капіталізму, перабудаваць мільёны дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарак на соцыялістычны лад.

І вось адметнай асаблівасьцю апошніх двух год якраз і зьяўляецца тое, што мы разгарнулі наступленьне па ўсім фронце і вырашаем важнейшую цэнтральнейшую задачу—задачу перарробкі мільёнаў дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарак. І на гэтай падставе, на падставе суцэльнай колектывізацыі, мы разгарнулі нябачаную ў сусьветнай гісторыі барацьбу за ліквідацыю апошняе сур'ёзнае капіталістычнае клясы, клясы кулакоў, міраедаў.

Партыя і пролетарыят атрымалі вялізарныя перамогі на гэтым фронце толькі таму, што мы здолелі наперакор поглядам, наперакор імкненьням правых ухілістых разгарнуць хуткім тэмпам індустрыялізацыю краіны і, выкарчоўваючы карэньні капіталізму ў краіне, мы выкарчоўвалі перш за ўсё ідэолёгічныя карэньні буржуазіі з шэрагаў нашай бальшавіцкай пролетарскай партыі (воплескі).

Пад якім-бы сьцягам ні імкнулася прыкрыць свае погляды агентура буржуазнай ідэолёгіі ўнутры нашай партыі,—ці пад сьцягам контр-рэволюцыйнага троцкізму, ці пад сьцягам правага ўхілу, ці пад сьцягам мо-ай рознастайнасьці ў выглядзе право-„лявацкага“ блёку,—партыя паленінску, па-марксысцку здолела выкрываць крок за крокам гэтую маскоўку, партыя пасьпяхова змагалася з ёю, і разбіла яе на-галаву (воплескі).

У гэтай барацьбе комсамол на чале з сваім ЦК займаў баявую позыцыю і давеў, што ён можа біцца за лінію партыі, за яе ленінскі ЦК (воплескі).

Дазвольце, таварышы, перадаць вам ад імя Цэнтральнага Камітэту партыі палкае бальшавіцкае прывітаньне (воплескі, выкрыкі „ура“).

1. Аб сучасным этапе будаўніцтва соцыялізму ў сьвятле гістарычных этапаў рэволюцыі

Пытаньне „хто-каго“ і ў с.-гаспадарцы вырашаецца на карысьць соцыялізму

Ленін марыў, бачыў у стварэньні хлебнага фронту базу для разьвіцьця соцыялістычнай гаспадаркі. Усьведамляючы ўсё значэньне перамогі на хлебным фронце, Цэнтральны Камітэт партыі павёў партыю, пролетарыят у лабавую атаку на кулака. І гэтая лабавая атака аказалася пасьпяховай, пераможнай (воплескі). Яскравым паказчыкам гэтага зьяўляецца той ясновы і рашаючы буйнейшы факт, што, калі ў самы цяжкі год, калі мы ўжывалі надзвычайныя захады да кулака, наперакор супраціўленьню правых, мы сабралі прыкладна каля 700 млн. пудоў хлеба (675 млн.) дык у гэтым годзе на базе савгасаў і колгасаў у выніку політыкі партыі мы ўжо сабралі мільярд 263 мільёны пудоў хлеба (бурныя воплескі).

Пераможнае наша наступленьне і вызначыла адказ на пытаньне, якое Ленін паставіў: „хто-каго“, ці кулак нас возьме за гдотку, ці кулак нас прымусіць пайсьці да яго спачатку на дробныя ўступкі, а потым і на большыя ўступкі, ці мы яму нанясем удар на хлебным фронце, каб затым разгарнуць барацьбу за канчатковую ліквідацыю яго як клясы.

Сёньня мы можам сказаць, што на падставе дасягненьняў у галіне колгаснага будаўніцтва, на падставе суцэльнай колектывізацыі мы пасьпяхова вядзем барацьбу за ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Мы маем вялізарнейшыя зьмены перш за ўсё ў сельскай гаспадарцы. Я ня буду тут прыводзіць вялікай колькасьці лічбаў, бо лічбы падан... ў вычарпальнай колькасьці ў нашым друку; асноўныя лічбы ў гэтай галіне прыводзіў тав. Сталін на 16 партзьезьдзе, а навейшыя даныя ў адносінах наступнага, трэцяга году пяцігодкі і вынікаў апошніх першых 2 год пяцігодкі прыведзены ў рашэньнях сьнежаньскага пленуму ЦК і ў дакладзе тав. Молатава на сэсіі ЦВК.

Я хачу толькі падкрэсьліць, што ў выніку зьмен у экономіцы нашай сельскай гаспадаркі, зьмен у соцыялістычнай структуры сельскай гаспадаркі мы будзем мець да канца 1931 году больш налов... колектывізаваных сялянскіх гаспадарак. Мы будзем мець 4 асноўныя збожжавыя вобласьці, амаль што цалкам колектывізаваных. Рост колектывізацыі прыводзіць ня толькі да зьмены соцыяльнай структуры нашай сельскай гаспадаркі, але і да росту экономічнага дабрабыту вёскі, росту экономічнага дабрабыту савецкай рэспублікі, росту колькасьці продуктаў у нашай краіне, росту колькасьці хлеба, тэхнічных культур. Зараз мы ставім перад сабою цэнтральнай задачай у галіне сельскай гаспадаркі вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы на базе савгасаў і колгасаў, таксама як мы вырашылі збожжавую праблему. Мы ўжо зараз пакрылі з лішкай тую ўдзельную вагу ў збожжавай гаспадарцы, якую займаў кулак, і разьбілі разьлікі правых, якія нас палохалі, што калі мы навядзем наступленьне на кулака, дык у нас ня будзе хлеба, у нас ня будзе продуктаў.

Па валавой продукцыі сельскай гаспадаркі доля аграмаджанага сэктару прадугледжвалася ў пяцігодцы для 1932-33 г, у 14,7 проц., фактычна-ж яна склала ў 1930 г, —24 проц., а ў 1931 годзе складзе—42 проц. Таварная-ж продукцыя аграмаджанага сэктару ў 1931 годзе складае больш 50 проц. усей таварнай продукцыі.

Мы, такім чынам пасьпяхова вырашаем пытаньне „хто каго“ на карысьць соцыялізму ў сельскай гаспадарцы, не гаворачы ўжо аб тым, што ў галіне прамысловасьці мы вырашылі гэта пытаньне канчаткова на карысьць соцыялізму. ДавоЇ прывесьці наступныя лічбы. Доля аграмаджанага сэктару ў валавай продукцыі прамысловасьці прадугледжвалася пяцігодкой для 1932-33 г. у 92,4 проц, а ўжо ў 1930 г. яна склала 92,4 проц, а ў 1931 г. яна складзе 97,5 проц.

Паказчыкам тэмпу нашага росту зьяўляецца рост валавой продукцыі нашай прамысловасьці.

У 1913 г. валавая продукцыя прамысловасьці ацэньвалася ў памеры 6.390 млн. руб. У 1930 г. яна ацэньвалася ў памеры 19.004 млн. руб., а ў 1931 г. яна склад е 27 мільярдаў рубл. тады як пяцігодка прадугледжвала рост валавой продукцыі прамысловасьці для апошняга году пяцігодкі ў памеры 32 мільярдаў рубаёў. Значэньне гэтых лічбаў можа быць лепш усвоена пры наступным параўнаньні. Плян ГОЭЛРО, прыняты ў 1920 годзе. намячаў рост прамысловасьці за 10 год на 80 проц., у параўнаньні з даваенным узроўнем. а ўжо у 1931 мы мелі павялічэньне валавой продукцыі прамысловасьці ў два разы ў параўнаньні з даваенным узроўнем. а ў 1931 годзе адзін прырост продукцыі прамысловасьці будзе роўны ўсей даваеннай продукцыі.

Адным з галоўнейшых і рашаючых паказчыкаў росту соцыялістычных элемэнтаў народнай гаспадаркі зьяўляецца агульны паказчык суадносін долі аграмаджанага сэктару і прыватнага ў асноўных фондах краіны. Па пяцігодцы—доля аграмаджанага сэктару ў 1932-33 г. павінна скласьці 68% усіх асноўных фондаў. У выніку двух год пяцігодкі доля аграмаджанага сэктару ў асноўных фондах павысілася, з 52% у 1927-28 г. да 62% у 1929-30 г. а ў 1931 годзе доля аграмаджанага сэктару дасягае 70% (69,1) усіх асноўных фондаў.

Што паказваюць прыведзеныя лічбы. Яны паказваюць, што задача „хто каго“ у галіне прамысловасьці мы ўжо вырашылі, а ў сельскай гаспадарцы мы блізкі да яе вырашэньня, і 1931 г. будзе годам, у якім мы ў асноўным заканчваем выкананьне задачы, пастаўленай Леніным,—задачы пабудаваньня фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Комсамол—перадавы змагар за тэмпы

Гэта і ёсьць паказчык таго што мы ня толькі пасьпяхова вытрымалі пераходны экзамен з 3-га на 4-ы курс, але мы блізкі ўжо да заканчэньня 4-га курсу, мы блізкі да заканчэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі, г. з блізкі да таго моманту, калі мы будзем непераможны. Гэта вызначае ўсю выканальнасьць задачы, пастаўленай Леніным,—задачы дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны. Мы разгарнулі нябачаную барацьбу за тэмпы. Комсамол быў не апошнім у гэтай барацьбе за тэмпы. Барацьба за тэмпы азначала ня толькі барацьбу з тымі, хто тармазіў гэтыя тэмпы, ня толькі барацьбу з правымі ўхілістымі і з троцкісцкімі элемэнтамі, якія ў сваіх поглядах а тэмпы індустрыялізацыі краіны вышліся. Барацьба за тэмпы азначала, што мы яе вялі ў нашым штодзённым жыцьці на практыцы. Барацьба за тэмпы прасякла ўглыб, у гушчы масы, на кожны завод, у кожны трэст, у кожнае гаспадарчае аб'яднаньне, у кожнае сяло. Барацьба за тэмпы азначала, што яе вялі, начынаючы з ЦК і канчаючы кожным заводам, кожнай групай заводзкіх ударнікаў.

Цэнтральны Камітэт партыі ў сваёй барацьбе за тэмпы не абмежаваўся агульнымі дырэктывамі, агульнымі ўказаньнямі. Адметнай асаблівасьцю работы Цэнтральнага Камітэту зьяўляецца тое, што мы пранікі ўглыб, у конкрэтныя пытаньні кожнага гаспадарчага аб'яднаньня, кожнага трэсту. Для нас лічбы пяцігодкі, устаноўленыя спачатку, ня былі фэтышам. Гэтыя лічбы мяняліся на-хаду па ўсіх галінах прамысловасьці і па нафце, і па вугалю, і па мэталю, і г. д.

Рабочыя масы зьнізу адгукнуліся на гэта ідэяй сустрэчнага прамфінпляну, якая зьяўляецца ідэяй барацьбы за тэмпы, барацьбы з тымі хто імкнецца спасылкамі на цяжкасьці тармазіць разьвіцьцё прадпрыемстваў, бо мы павінны ведаць, што справа ня толькі ў тым, каб пабудаваць новы завод, а справа ў тым, каб умець рацыянальна выкарыстаць тыя заводы, якія існуюць, рацыянальна выкарыстаць абсталяваньне, рацыянальна выкарыстаць нашы магчымасьці па павялічэньню колькасьці сыравіны, па павялічэньню колькасьці паліва, па павялічэньню колькасьці мэталю, вугалю і г. д. У выніку мы зараз можам сказаць, што лёзунг, выкінуты масамі, лёзунг „Пяцігодка—у чатыры гады“—не фантазія гэтых альбо іншых фразёраў, а вынік вопыту самых мас, вынік вопыту нашай партыі, вынік вопыту пролетарыяту і сялянства. І мы можам сказаць, што гэты лёзунг мы ажыцьцёвім: мы выканаем пяцігодку ў чатыры гады (бурныя воплескі).



Тав. Кагановіч робіць даклад на IX зьездзе ЎсеЛКСМ

На 16 зьездзе партыі тав. Сталін указаў, што ні адна краіна ў сьвеце ня ведае такіх шалёных тэмпаў разьвіцьця і росту, як наша краіна, бо наша краіна ўладае тымі ўласьцівасьцямі і перавагамі, якімі ня можа аўладаць капіталістычная краіна. Гэта пак звае той факт, што, ня гледзячы на сыстэматычнае шкодніцтва клясавых ворагаў, ім не давялося затармазіць бурны рост соцыялістычнай гаспадаркі, бо ў руках пролетарскай дзяржавы згуртаваны усе рэсурсы краіны; мы рэгулюем і плянуем усе галіны народнай гаспадаркі. Калі, напрыклад, да апошняга году мы для сельскай гаспадаркі вызначылі больш ці менш прыблізныя пляны, калі мы яшчэ не маглі называць поўнасьцю нашы кантрольныя лічбы народна-гаспадарчым плянам, дык апошні пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б), разглядзеўшы кантрольныя лічбы па існасьці, ужо назваў гэта народна-гаспадарчым плянам, які вызначае ход разьвіцьця для ўсіх галін народнай гаспадаркі, у тым ліку і для сельскай гаспадаркі.

...начэньне нашага росту добра разумеюць нашы ворагі. Ворагі нашы ра умеюць, што азначаюць рост і разьвіцьцё народнай гаспадаркі ва ўмовах Савецкага Саюзу. Яны ўжо не сьмяюцца над пяцігодкай, як сьмяяліся раней, а яны ўжо хутчэй плачуць ад гэтай пяцігодкі, бо яны бачаць, што побач з нашым ростам у іх упадак.

2. Суадпаведнасьць паміж будуючымся соцыялізмам і капіталізмам і агульны малюнак сусьветнага становішча

Савецкі Саюз мае вялізарную будучыню. Перад намі вялізарнае поле дзейнасьці, мы павінны прыкласьці ўсе вашы сілы для пасьпяховага заканчэньня нашага будаўніцтва. Павышэньне дабрабыту рабочае клясы нашай краіны залежыць ад росту соцыялістычных элемэнтаў народнай гаспадаркі. І гэта добра ведаюць рабочыя, бо, калі-б рабочыя гэтага не разумелі, у нас ня было-б той хвалі зусім новых форм удзелу мас у соц. будаўніцтве, як соц. спаборніцтва і ударніцтва, сустрэчны прамфінплян і г. д. і г. д. Соц. спаборніцтва і ўдарніцтва адрозьніваюцца ад другіх форм удзелу мас у соц. будаўніцтве тым, што гэта ёсьць новае гістарычнае зьявішча, якое прапаведваў Ленін, якое, пачаўшыся з паасобных суботнікаў, ператварылася ў масавы рух мільёнаў. Гэта адбываецца таму, што рабочыя разумеюць усё значэньне нашай будоўлі для справы соцыялізму, для росту дабрабыту рабочае клясы і ўсёй краіны.

І мы, таварышы, можам сказаць, што ў выніку апошніх двух год нашай работы мы маем рост матэр'яльнага дабрабыту рабочых мас.

У той час, як за-межамі беспрацоўе расьце, у той час як за-межамі мы зьяўляемся сьведкамі росту жабрацтва мас, мы бачым, што ў нас беспрацоўе амаль зьнікла і матэр'яльны дабрабыт мас расьце.

Вось артыкул аднаго амэрыканскага пісьменьніка Тэодора Драйзэра. Завецца ён „Беспрацоўе у Нью-Ёрку“. Драйзэр прыводзіць жахлівыя вобразы беспрацоўя ў Амэрыцы. Услухайцеся ў апавяданьне гэтага пісьменьніка:

„Міласьціна і падаяньне—вось усё, што знаходзяць для арміі беспрацоўных людзей, якія могуць і жадаюць працаваць і толькі зараз па віне экономічнай і соцыяльнай разрухі, створанай самім урадам, аказаліся без работы. Але нідзе і ніхто не заікнуўся яшчэ аб пяцідзённым тыдні, які і-нуе ў СССР, аб увядзеньні 7-мі альбо 6-ці гадзіннага рабочага дня на якім-небудзь прадпрыемстве, альбо хаця-б у самых урадавых установах з мэтай паменшаньня беспрацоўя.

У шмат якіх раёнах Нью-Ёрку беспрацоўе з усімі яго жахамі моцна ўвайшло ў жыцьцё. У кастрычніку 1930 году я праходзіў па Боуэры і бачыў маладых хлапцоў і моцных мужчын, якія сядзелі на тротуарах, гуртаваліся вакол вулічных ліхтароў, альбо спалі на дзеравяных памостках перад складамі. Я прыкмеціў, што ў многіх з іх барада адрасла на цэлы вяршок. А ў гэтым-жа раёне пабрыцца каштуе ўсяго пятак. Але ў гэтых людзей няма пятака.

Доктар Уайн, які ведае публічнымі школамі Нью-Ёрку, сьцьвярджае, што ў Манхаттане, дзе маецца 75.000 школьнікаў, хворых на сухоты, дзеці ўсё часьцей і часьцей недаядаюць.

(Працяг на 2 стар.).

*) Даклад друкуецца ў скарочаным выглядзе.

Мы разгарнулі нябачаную барацьбу за тэмпы

Міжнароднае і ўнутранае становішча і задачы комсамолу

Даклад тав. Кагановіча на IX-ым зьезьдзе ЎсеЛКСМ

Урад організаваў шэраг агенцтваў для падшуканьня работы беспрацоўным. Але знайсьці зараз работу так-жа немагчыма, як і адкрыць залатыя россыпі на Брадвэі. У верасьні гэтыя агенцтвы штодзённа аблягаліся 7—8 тысячамі беспрацоўных, а атрымала работу ня больш 200 чалавек.

Я-ж хачу сказаць з гэтай прычыны наступнае. Народ павінен ведаць пра сапраўдныя прычыны сучаснай дэпрэсіі: лёгка здабытыя грошы, рызыкоўная гульня на біржы і нікім не кантраляваныя вытворчасць і праца. У сувязі з крызісам трэ было-б выкарыстаць шмат якія мерапрыемствы Савецкай Расіі, як напрыклад, 6-ці гадзінны рабочы дзень у пяцідзённы тыдзень.

Комунізм? Пагроза нашаму ладу?

Усякі іншы шлях будзе небясьпечны".

Наш рабочы ведае, што будучыня за ім

Вось як адзін з дробнабуржуазных пісьменьнікаў Тэодар Драйзэр апавядае аб становішчы рабочых у Амэрыцы і той выхад, аб якім ён баіцца сказаць проста, але да якога ён мімаволі падыходзіць. Бачачы нашыя дасягненьні, нашыя магутныя дэманстрацыі, нашыя ворагі ня мала зьдзіўлены. Здавалася-б, у нас цяжкасьці, адкуль жа бярэцца гэты энтузіязм рабочае клясы, энтузіязм моладзі ў нашай Савецкай краіне? Яны не разумеюць таго, што наш рабочы бачыць і ведае, што будучыня—за ім, што кожны дзень прыносіць яму ўсё новае і новае палепшаньне. Рабочыя ведаюць, што, колькі працаздольнай моладзі ні будзе прырастаць штогод, яны будуць заняты работай, яны ня будуць у тым жахлівым становішчы беспрацоўных, у якім знаходзяцца рабочыя Ангельшчыны, Амэрыкі і Нямеччыны. Яны атрымаюць работу, таму, што яны ведаюць, што кожны месяц адчыняюцца ўсё новыя і новыя соцыялістычныя фабрыкі, кожны месяц пачынаюць дыміцца ўсё новыя і новыя трубы.

Мы маем рост добрабыту рабочай сям'і. Шмат ужо сямей, у якіх працуе па 3—4 чалавекі. У нас расьце жыльлёвае будаўніцтва, і ў 1931 г. будзе патрачана 1.100 млн. рублёў. Расьце фонд соц. страхаваньня, які складзе ў 1931 г. 2.100 млн. руб. Расьце агульны ўзровень матар'яльнага дабрабыту рабочых і ў прыватнасьці моладзі. У сувязі з вашым зьездам я спрабаваў праз групу комсамольцаў абсьледваць бюджэты рабочай моладзі. Абсьледвальнікі проста са слоў рабочай моладзі наносілі запісы. Дазвольце прывесьці з гэтай пачкі абсьледваньняў некаторыя тыпавыя даныя.

Беспрацоўе, 10-гадзінны рабочы дзень,—голад—такі ўдзел рабочых і моладзі за мяжою

Супастаўце гэтыя даныя з данымі аб становішчы моладзі на Захадзе і вы ўбачыце, наколькі ўразьлівы малюнак.

Па даных Выканкому Комінтэрну моладзі, малады мэталісты Нямеччыны зарабляе 12—16 марак у тыдзень, ці 6—8 рублёў у тыдзень альбо, 24—32 рублі ў месяц. Лодзінскі малады тэкстыльшчык зарабляе максымум 35 злотых у месяц (каля 8 рубл). Французскі малады рабочы зарабляе 110—130 франкаў, ці 7-8 рубл. у паўмесяца.

Да гэтага трэба дадаць зьніжэньне зарплаты, якое б'е ў першую чаргу па моладзі. 8—9 гадзінны рабочы дзень і нават 12 гадзінны, рост беспрацоўя. Так з 25 млн. беспрацоўных, якія налічваліся ў сьнежні 1930 г., ня менш 6 млн. падае на моладзь, пры тым у Злучаных Штатах беспрацоўная моладзь зусім не атрымоўвае дапамогі, а ў эўропэйскіх краінах атрыманьне дапамогі да крайнасьці абмежавана.

Па офіцыйных даных нямецкага буржуазнага саюзу моладзі, 40 проц. маладых рабочых працуе 10 гадзін, 30 проц.—9 гадз. І так—па большасьці краін.

Даволі гэтага параўнаньня, каб упэўніцца ў росьце дабрабыту рабочых і моладзі ў прыватнасьці ў нас у краіне ў параўнаньні з усё пагаршаючымся становішчам рабочых на Захадзе. Менавіта з прычыны нашых посьпехаў так хвалююцца капіталістыя чужаземных дзяржаў, іх вучоныя ідэолёгі.

Неабходна адзначыць, што дзякуючы росту крызісу ў чужаземных дзяржавах і росту гаспадаркі ў нас, асабліва ўзмацнілася зацікаўленасьць да нашай пяцігодкі.

Вымушанае прызнаньне ворагаў

Вы ўжо, напэўна, чыталі артыкул Лёйд Джорджа, у якім ён даваў ацэнку нашай пяцігодкі і нашай палітыкі. У гэтым артыкуле ён падкрэсліваў нашыя дасягненьні і нашу сілу. А вось нядаўна была апублікавана такая тэлеграма з Нью-Ёрку.

„Публікуючы справаздачу аб абмеркаваньні 3-6 сьнежня ў Нью-Ёрку канферэнцыі таварыства тэйлерыстых, кіруючы орган амэрыканскай металюргіі „Айрон эйдж“ адзначае, што найбольш выдатнымі момантамі канферэнцыі былі два даклады аб СССР.

Першы даклад быў зроблен Осьцінам, прэзыдэнтам кампаніі „Осьцін“, якая працуе ў СССР на падставе дагавору аб тэхнічнай дапамозе. Осьцін заявіў: „Якія-б ні поглядаў ні прытрымліваліся ў адносінах Расіі і рускіх, іх ідэй і ідэалаў, бязумоўна, што тое, што яны робяць, зьяўляецца выклікам прамысловай перавазе Амэрыкі“. Указваючы шэраг эканамічных момантаў, якія палягчаюць СССР стварэньне магутнай індустрыі па апошняму слову тэхнікі і адначасова ўказваючы, што „Расіі не хапае толькі кваліфікаваных рабочых і кіраўнікоў“, Осьцін заявіў, што „да гэтага часу пасьпехі пяцігодкі ў пляну зьяўляюцца цалкам дасягнутымі“.

Беларуская дэлегацыя IX-га зьезду ЎсеЛКСМ у перапынку абгаварвае даклад ЦК.

Прафэсар Броўнскага унівэрсытэту Гейнрыхс, які таксама пабыў у СССР, прысьвяціў сваю прамову тэорэтычным магчымасьцям, якія адкрываюцца выкананьнем пяцігодкі не толькі перад савецкай, але і перад сусьветнай гаспадаркай. „Да гэтага часу,—сказаў Гейнрыхс,—страты ў прамысловасьці, выкліканыя няправільнай арганізацыяй гаспадаркі, зьяўляліся неабходным злом, бо выбару не было, прынцыпы правільнай арганізацыі ў гаспадарцы не былі вядомы. Калі савецкі вопыт удасца, дык ідэя ўнікненьня страт у прамысловасьці перастане быць утопіяй і стане зусім канкрэтнай задачай з жывым прыкладам на вачох“. Спыніўшыся на пытаньнях аб манаполіі замежнага гандлю ў СССР, прафэсар Гейнрыхс адзначыў, што ў плянавай гаспадарцы СССР суровы кантроль на замежным гандлем зьяўляецца абсалютнай неабходнасьцю, інакш плян знаходзіўся-б пад пагрозай зрыву.

Супастаўляючы затым ПАЗШ і СССР прафэсар Гейнрыхс заяўляе, што прынцып савецкага пляну зьяўляецца поўнай процілегласьцю амэрыканскім разуменьням, згодна з якімі вытворчасьць абмяжоўваецца толькі тымі колькасьцямі, якія могуць быць прададзены з прыбыткам.

Гэта, па словах Гейнрыхса, прывядзе ў будучым да таго, што ПАЗШ будуць адсунуты з цяперашніх сваіх камандных вышынь на задні план.

У апошні час лічба далатных водгукаў аб нашай пяцігодкі значна павялічылася.

Крызіс ахоплівае ўвесь капіталістычны сьвет

Прашоўшыя 10 м-цаў з часу 16 зьезду нашай партыі, на якім быў дадзен аналіз сусьветнага становішча і крызісу ў капіталістычных краінах, ня толькі не абвергнулі ніводнага слова з гэтага аналізу, але, наадварот, цалкам і поўнасьцю яго пацьвердзілі.

Вось лічбы за першыя 9 месяцаў 30 году.

Сусьветная продукцыя чыгуна без СССР панізілася на 16,1 проц., у ПАЗШ—на 21,4 проц., на 22,6 проц. — у Нямеччыне. Сусьветная продукцыя сталі зьнізілася на 19,3 проц., вугалю—на 8,1 проц., машына-будаўнічая прамысловасьць у Амэрыцы зьнізілася на 24 проц., па ліцейнаму абсталяваньню і на 49 проц. па варштатам. Вытворчасьць аўтомобіляў у Амэрыцы зьнізілася на 36,9 проц. і на 30,8 проц. у Нямеччыне.

Гэты крызіс зачапіў таксама і Францыю. Праўда, процант зьніжэньня ў Францыі значна меньш, чым у іншых краінах, але прогноз аб тым, што і Францыя ня мінуе крызісу, апошнія месяцы разьвіцьця гаспадаркі ў Францыі цалкам і поўнасьцю пацьвярджаюць.

Вось ужо паўтары гады, як у Амэрыцы бушуе крызіс. Дзеныя буржуазнага экономічнага часопісу „Анналіст“ выводзяць такі малюнак: вытворчасьць чыгуна ў ліпені 29 году выражалася па гэтаму індэксу 127,4 адзінкі, а ў лістападзе 1930 году—у 60 адзінак. Вытворчасьць сталі ў ліпені 1929 году—130,8 проц., у лістападзе 1930 г.—56,8 проц. Вытворчасьць аўтомобіляў адпаведна выражалася ў 137,1 і 48,1 адзінак. Агульны індэкс у ліпені 1929 г. раўняўся 108,5 адзінак, а ў лістападзе 1930 г.—76,5 адзінак. Вастрыня крызісу дашла да таго, што для выхаду з становішча ставяць пытаньне аб пераходзе ад перадавой тэхнікі да ручной працы. Адзін амэрыканскі часопіс „Навіны машына будаваньня“ нават адвёў гэтаму цэлую перадавіцу. У перадавіцы пад назвай „Ручная праца супроць машыннай“ мы чытаем:

„Ці патрэбна на час адмяніць машыны таму, што ў нас так многа беспрацоўных? Гэта цяпер вострае пытаньне для многіх гарадзкіх інжынэраў і муніцыпальных улад. Многія з іх ўжо далі адказ на карысьць ручное працы. Даволі адзначыць некалькі выпадкова ўзятых прыкладаў. Мінэаполіс (горад у ПАЗШ) мае намер выкарыстаць у сваёй зімовай програме будаўніцтва толькі працаўнікоў з кіркай і лапатай замест машын. Бастон сьпыняе скарыстаньне машын, якія ўжываліся для ачысткі вуліц пасьля сьнегападу.

Часопіс протэстуе супроць таго, што гэта своеасаблівы мэтод барацьбы з беспрацоўем пачалі ўжываць, галоўным чынам у гарадзкім будаўніцтве. „Магчыма было-б замяніць мільён людзей, калі скарыстаць старыя варштаты замест новых, вывесьці з строю старыя пад'ёмныя краны і другія транспартныя мэханізмы, выкінуць машыністак і пачаць пісаць усе лісты ад рукі, словам калі ісьці назад ва ўсім. Гэтага аднак-жа ніхто не прапануе, дык чаму-ж толькі будаўніцтва абралі ахвярай? Калі можна,—іранізуе часопіс,—адхіліць машыны для ўборкі сьнегу, якія шпарка адна[ў]ляюць гарадзкі рух, дык-жа яшчэ лепш узброіць людзей, прыбіраючых сьнег, не лапатамі, а чайнымі лыжкамі“ (Сьмех).

Удумайцеся ў значэньне гэтых фактаў.

Мы з вамі купляем новыя варштаты, мы будуем заводы, якія будуць вытвараць новыя варштаты з паскоранай працай, а ў Амэрыцы даходзяць да таго, каб перавесьці людзей на больш марудныя варштаты, абы заняць большую колькасьць рук, вывесьці з строю пад'ёмныя краны і інш. транспортныя мэханізмы. Мы з вамі абгаварваем тут пытаньне аб тым, каб будаваць новыя заводы па пад'ёмным кранам, па транспортным мэханізмам. Там хочуць выкінуць машыністак і пачаць усе лісты пісаць ад рукі, а мы будуем заводы пішучых машын, хочам паставіць вытворчасьць наборных машын. Мы рухаемся ўперад да новай тэхнікі. У Амэрыцы-ж шукаюць выхаду ў тэхнічным рэгрэсе.

Капіталістыя шукаюць выхаду у вайне і інтэрвэнцыі

Буржуазія шукае выхад з крызісу ў суровай эксплёатацыі рабочае клясы у далейшай фашызацыі і падрыхтоўцы да новай імпэрыялістычнай вайны. На гэтай аснове мы маем безумоўнае далейшае абвастрэньне супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі краінамі. Факты апошняга пэрыоду паказваюць, што вузлавым пунктам гэтых супярэчнасьцяй усё яшчэ застаюцца англа-амэрыканскія супярэчнасьці. За апошні пэрыод асабліва распалілася паветра паміж Францыяй і Італіяй. А ў самы апошні час у сувязі з фінансавымі ўзаемаадносінамі намецілася некаторае абвастрэньне адносін паміж Францыяй і Ангельшчынай.

Нават Лёйд Джордж вымушан прызнаць, што супярэчнасьці накапліваюцца і атмосфэра паветра распальваецца. І сапраўды ніколі ня было такога росту ўзбраеньня, якое мы маем зараз. І капіталістыя шукаюць „выхаду ў імпэрыялістычнай вайне і інтэрвэнцыі“. Але затое рабочыя шукаюць „выхаду ў рэвалюцыі“ (Сталін). Рабочыя шукаюць выхаду не ў імпэрыялістычнай вайне, а ў рэволюцыйным узброеным паўстаньні. Абвастраецца клясавая барацьба, расьце рэволюцыйны рух, растуць нашы братэрскія комуністычныя партыі. Я ня буду пералічваць факты з гэтай галіны яны ў большасьці сваёй друкаваліся ў газэтах. Адзначу забастоўку рурскіх гарнякоў, якая ахапіла многія дзесяткі тысяч рабочых, якая хоць і скончылася паражэньнем, але яна многаму навучыла рабочую клясу. Канец рурскай стачкі нельга прыняць, як канец барацьбы рурскіх шахцёраў і другіх рабочых Нямеччыны. Гэта толькі пачатак сур'ёзнай барацьбы. Прыкметна растуць нашы братэрскія партыі.

Вы ведаеце, што Комінтэрн за апошні час прыклаў многа сіл па падняцьцю баяздольнасьці нашых братэрскіх компартый, па іх умацаваньню, па барацьбе з опортунізмам у іх шэрагах. І трэба сказаць, што шэраг братэрскіх партый, і ў першую чаргу нямецкая партыя, перайшоў у новую вышэйшую клясу. Яна павялічыла колькасьць сваіх членаў, вырасшы з 125 тысяч да 155 тысяч членаў партыі.

Буйнейшым дасягненьнем зьяўляецца ўмацаваньне комуністычнай партыі ў Індыі, дзе рэволюцыйны рух, як вы ведаеце, разгортваецца і ахоплівае ўсё больш і больш шырокія масы. Аформілася таксама компартыя Інда-Кітаю. Расьце кітайская компартыя, якая налічвае да 200 тысяч членаў у сваіх шэрагах.

Недарэчныя байкі аб „дэмпінгу“ і „прымусовай працы“—чарговая форма антысавецкай кампаніі

Рост рэволюцыйнага руху не дае супакою капіталістым, і гэта павялічвае іх ненавісьць да нашай краіны. Мы зьяўляемся сьведкамі таго, як да XVI-га партыйнага зьезду, так і пасьля XVI-га зьезду кампанія супроць Савецкага Саюзу не памяншаецца, а расьце, прымаючы розныя формы. Даволі пералічыць такія факты, як кампанія супроць уяўнага дэмпінгу, кампанія супроць выдуманай прымусовай працы ў СССР, аграрная канфэрэнцыя ў Польшчы, падарожж[…] французскіх генэралаў у Польшчу Румынію і іншыя краіны, спроба бл[…]кады ў СССР, якая знашла сва[…] аформленьне ў вядомым дэкрэц[…] французскага ўраду,—каб упэўніцц[…] ў тым, што кампанія супроць Савецкага Саюзу вядзецца організавана сыстэматычна, што гэта працяглая кампанія імпэрыялізму супроць растучага соцыялізму.

Асабліва сьмешнай зьяўляецца кам[…]панія супроць нібыта прымусовай працы. Падумайце толькі. Капіталісты, драпежнікі, эксплёататары, ула[…]сьнікі нявольнікаў, якія „ператварылі вольнага рабочага ў нявольніка, га[…]лоднага, беспрацоўнага, шлындаючага па вуліцах Нью-Ёрку, Бэрліна, гэты самыя імпэрыялістыя і драпежнікі протэстуюць супроць нібыта прымусовай працы ў нас. Гэта сьмешна недарэчна, але гэта факт. Гэта капіталістым патрэбна для таго, каб за[…]мазаць перад масамі абвастрэньн[…] крызісу. Процэс „Прампартыі“ пака[…]заў, наколькі глыбокі карэньні інтэр[…]вэнцыі супроць нас. Процэс „Прам[…]партыі“ выявіў, што буржуазея […] асобе французскага генштабу на пра[…]ця у апошніх шэрагу год, з году […] год, падрыхтоўвала змову супро[…] Савецкага Саюзу, падрыхтоўвала ін[…]тэрвэнцыю з унутраным паўстаньне[…] супроць нас. Гэта ім не ўдалося толь[…]кі таму, што наша сіла, наша мо[…] разбіла ўсе іх спробы. Зачыншчык[…] вайны спрабуюць зараз замазаць сьля[…]ды, быццам—„я не я, и лошадь н[…] моя“.

Небясьпека інтэрвэнцыі ня мінул[…] процэс „Прампартыі“ на некаторы ча[…] можа быць адцягнуў інтэрвэнцы[…] супроць нас. На некаторы час м[…] сарвалі пляны імпэрыялістых тым, шт[…] мы перад усім сьветам выкрылі, хт[…] супроць каго рыхтуе вайну. Але м[…]ні ў якім разе не павінны супако[…]вацца на гэтым. Мы павінны пам[…]таць, што хаця магчымы некаторы[…] пэрыяды зацішша, мы маем спра[…] з організаванай падрыхтоўкай вайн[…] супроць нас.

Вось чаму мы павінны з усёй с[…]ла[…] паставіць пытаньне аб умацаван[…] абароназдольнасьці краіны. Вось чам[…] Саюз Комуністычнай Моладзі і ўс[…] моладзь павінна мобілізаваць свае с[…]лы на ўмацаваньне Чырвонай арміі […] баявую падрыхтоўку моладзі. Комс[…]мол павінен выкаваць ня толькі до[…]рых барацьбітоў арміі і флёту, але[…] тысячы, дзесяткі тысяч тэхнічна па[…]рыхтаваных камандзіраў, якія ў вы[…]падку вайны стануць уперадзе б[…]рацьбітоў і павядуць іх на барацьб[…] да перамогі над сусьветным капітал[…]мам.

Наша задача—працягваць палітык[…] міра, якую вядуць партыя і савецк[…] ўлада, і не даваць сябе провакаваць[…] Наша задача,—мацаваць наш са[…] з сусьветным пролетарыятам і пам[…]таць, што ў барацьбе з нашым вор[…]гам—сусьветным імпэрыялізмам—н[…]шай арміяй зьяўляецца ня толь[…] Чырвоная армія, ня толькі рабочыя сяляне нашай краіны, але і пролета[…]рыят усяго сьвету, які стане на аб[…]рону савецкай рэспублікі—бацька[…]шчыны сусьветнага пролетарыят[…] (воплескі).

Наша задача—забясьпечаньне ўз[…]тых тэмпаў індустрыялізацыі, бо д[…] ўмацаваньня пляну абароназдольнас[…]ці краіны патрэбна мець ня толь[…] добра абучаную, стойкую, але і до[…]ра аснашчаную тэхнікай Чырвону армію, якая-б стаяла на ўзроўні с[…]часных армій. Без забясьпечаны[…] ўзятых тэмпаў, без далейшага рос[…] гаспадаркі, без выкананьня пяцігод[…] ў чатыры гады мы пасьпяхова […] здолелі-б выканаць гэтай задачы.

3. Капіталістычнае абкружэньне, цяжкасьці і задачы соцыялістычнаг[а] будаўніцтва

Комуністыя-марксыстыя павінны ўмець бачыць поле бою, усе вучасткі фронту моцныя і слабыя. Мы павінны ведаць сваю сілу і ня траціць упэўненасьці ў посьпехі нашай справы, але трэба ведаць і свае слабыя бакі, каб не заспакайвацца, не пачываць на лаўрах, не заражацца фаталізмам—моў, пабудова соцыялізму ў нашай краіне забясьпечана—не заражацца самацёкам, а па-бальшавіцку мобілізаваць усе сілы і прывесьці ў рух і баявую гатоўнасьць усе організацыі, усе вагары, каб пасьпяхова выканаць пастаўленыя задачы, каб і далей ісьці ад перамогі да перамогі. Гэта заўсёды было моцным бокам нашай партыі і ніякая боязьнь выкарыстаньня ворагамі нашых памылак, адкрытага выяўленьня нашых недахопаў і цяжкасьцяй нас не палохала. Ня толь[…] нашы клясавыя ворагі, але і ўнут[…] партыйныя, варожыя ленінізму сі[…] скарыстоўваюць малейшыя цяжкась[…] для таго, каб падарваць палітыку па[…]тыі. Мы з гэтым ня лічы[…]ся і ня лічымся, бо перш за ў[…] мы ведаем, што нашы цяжкас[…]ці выцякаюць з грандыёзнасьці т[…] задачы, якую перад сабой паставі[…] Выходзячы з гэтага, неабходна ўяс[…]ніць зусім дакладна сапраўдны ст[…]рэчаў, каб зразумець, што патрэб[…] рабіць.

(Канец будзе)

НЭРВЫ КРАІНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ НЕПАРУШНЫМІ

Опортуністычная практыка гэрояў чарапашых тэмпаў, носьбітаў абломаўшчыны з Гомельскага чыгуначнага вузлу стварае рэальную пагрозу зрыву работ на важнейшых вучастках социялістычнага будаўніцтва, чым сьвядома дапамагае клясаваму ворагу

Комсамолія чыгунак! Мобілізуйце ўсе свае сілы на барацьбу за ліквідацыю прарываў, супроць „пробак“ і ўсіх недахопаў у нашым транспорце

Аб чым гудуць гудкі

Апошнія падзеі на чыгунцы прымушаюць зьвярнуць увагу ўсёй грамадзкасьці на становішча нашага транспорту і барацьбу грамадзкіх арганізацый чыгункі.

ерад транспортам у пэрыод выканьня плянаў 3-га, рашаючага пяцігодкі паўстаюць надзвычайна вялікія і адказныя задачы.

прыватнасьці пасьпяховае правядзеньне вясеньняй пасеўнай кампаніі залежыць ад таго, наколькі транспорт будзе здольны перакінуць патрэбную колькасьць машын на ., перавезьці патрэбную колькасьць насеньня.

гэты-ж час хронічныя спазьненьні, крушэньні, пробкі на вузлах увайшлі ў сыстэму, барацьба з пастаўлена надзвычайна слаба. бскі чыгуначны нузел атрымаў „рапаху“ за сваю працу. Але не мобілізавала грамадзкую у чыгуначнікаў на ліквідацыю прарываў, якія былі на Віцебскім вузьле.

ыгунцы патрэбны кадры. Віцебская комсамолія накіравала некаю частку сваіх членаў на ліквідацыю прарыву на чыгунцы. Ня зячы на гэта, чыгуначны вузел хапіў гэтых комсамольцаў, ня еў іх скарыстаць, як сьлед.

тановішча з падрыхтоўкай кадраў праз ФЗВ чыгуначнікаў таксама мушае ўздымаць пытаньне аб , што апартуністычная недаацэнкаекаторых арганізацый павінна мацц руйнуючы адпор і вакол лы ФЗВ чыгуначнікаў павінны створаны сапраўды спрыяючыя зы.

удкі спазьніўшыхся цягнікоў уць на дапамогу. Яны клічуць вяшчаюць аб вялікай небясьпецы. Комсамальская арганізацыя па кінуць усе свае сілы на дагу чыгунцы, на ліквідацыю прарываў, якія там ёсьць.

На Гомельскім вузьле небясьпечна

Апошнія падзеі на Гомельскім чыгуначным вузьле сьведчаць аб наяўнасьці шкодніцтва з боку клясавага ворага, які тут знайшоў сабе добры прытулак. Аб гэтым сьведчыць многа фактаў з жыцьця і становішча вузла.

У Гомель павінен быў прыйсьці пасажырскі цягнік. За 5 хвілін да яго прыбыцьця насустрач яму пайшоў паравоз бяз брыгады. Ад крушэньня і людзкіх ахвяр выратавала чыгуначная „дакладнасьць“. Пасажырскі цягнік спазьніўся і паравоз невядома кім пушчаны насустрач цягніку, на 7-м клёмэтры ад Гомеля спыніўся, страціўшы пар.

Калі рамантавалі Рэчыцкі мост, цягнікі павінны былі абходзіць гэтае месца па няправільным шляху, але здарылася выключэньне з правіла і праз неадрамантаваны мост накіроўваюць цягнік. У выніку — пабітыя вагоны і паравоз.

У запасе стаяць усе спраўныя паравозы. Кожны паравоз можна на працягу дзьвёх гадзін падрыхтаваць пад цягнік. Калі-ж узялі адзін з гэтых паравозаў, дык аказалася, што яго кулісны валік заварены. Куліса—гэта галоўны сустаў у паравозе, самы маленькі недахоп у ёй прымушае паравоз ня толькі „кульгаць“, але і зусім не кранупца з месца.

Быў такі выпадак. Трэ' было даць паравоз пад цягнік, але... не аказалася кулісаў. Абегалі некалькі гектараў ля Гомельскага дэпо, але кулісаў ня было. Выклікалі ДПУ, пачалі шукаць і знайшлі кулісу ў металяломе.

Усе гэтыя факты прымушаюць паставіць пытаньне аб дзейнасьці комсамольскай ячэйкі, аб яе барацьбе за выкананьне прамфінпляну.

У гэтай галіне комсамольская ячэйка нічога не зрабіла.

Калі сэкратар комсамольскай ячэйкі пайшоў на дапрызыўную падрыхтоўку, дык ячэйка больш трох тыдняў была без кіраўніцтва. Толькі праз некаторы час зрабілі перавыбары бюро і распачалі працу

Калі на агульным сходзе рабочых мясцком ставіў пытаньне аб асеньнязімовых перавозках, ячэйка таксама склікае сход і абгаварвае нац. пытаньне.

Такім чынам, замест увязаць усю работу, прыстасаваць політычна-гаспадарчыя кампаніі да задач нацыянальна-культурнага будаўніцтва, ячэйка разьбівае гэтыя пытань і, не мобілізуе ўвагу комсамольцаў на галоўныя вузлавыя пытаньні.

Комсамолец Рачко робіць прагул у 9 дзён. Яго выключаюць з комсамолу, з саюзу, зьнімаюць з працы, але вакол гэтага факту не складаюць грамадзкае думкі. Праз некалькі дзён на чорнай дошцы зноў вывешваецца аб'ява: „Ілжэўдарнік комсамолец Гутэнтаў прагуляў 4 дні“.

„Ілжэўдарнік комсамолец“. Хіба гэтыя словы можна ставіць побач, яднаючы ў адно. Што зрабіла ячэйка для таго, каб гэтыя факты папярэдзіць, і калі зьявіліся—зьвішчыць?!

Комсамольская ячэйка нічога не зрабіла для таго, каб дабіцца павароту комсамолу тварам да задач барацьбы за прамфінплян.

З 1-га студзеня 9-ты вучастак павінен быў перайсьці на 7-гадзінны рабочы дзень. Але дагэтуль працуюць яшчэ па-старому, ня ведаюць, калі змогуць увесьці сямідзёнку. Начальнік вучастку—Галавач—кажа:

— Лічбы сьведчаць аб тым, што к пераходу на 7-гадзінную працу мы яшчэ не падрыхтаваліся. Ды і як пераходзіць, калі ў нас зусім няма чорнарабочых і не хапае сьлесароў.


На 9-м вучастку цяті становішча трывожнае.

Мы сыгналізуем небясьпеку зрыву выкананьня трапфінпляну і падрыхтоўкі чыгункі да вясеньня пасеўнай кампаніі. Неабходна прыняць рашучыя захады.

Ціхон Палын

Гомель

Нярэдкі выпадак



Толькі што выпушчаны з рамонту паравоз, у якога пры манэўрах на станцыі Ельц выскачыла цялежка з двумя скатамі. Гэткі выпадак нярэдкі на нашых чыгуначных станцыях.

Даць кадры чыгунцы

Масква, 12.— Наркомпрацы СССР вынес пастанову зьвярнуць транспорту былых транспортных рабочых, якія працавалі ў апошнія пяць год на чыгуначным транспорце. Кіраўнікі гаспадарчых органаў прадпрыемстваў, за выключэньнем працуючых на абарону, у дэкадны тэрмін са дня выданьня пастановы, абавязаны выявіць і перадаць у распараджэньне мясцовых аддзелаў працы асоб, наступных спэцыяльнасьцяй: машыністых паравозаў і іх памоцнікаў, кваліфікаваных рабочых па рамонту цягнікавага складу; работнікаў кваліфікаваных на работах, зьвязаных з абслугоўваньнем руху цягнікоў; інжынэраў і тэхнікаў транспортных спэцыяльнасьцяй.

Аддзелы працы абавязаны праз кожныя пяць дзён паведамляць у Наркомпрацы СССР аб ходзе работы па звароту работнікаў на транспорт. Уся работа па звароту былых работнікаў на транспорт павінна быць закончана не пазьней 1-га сакавіка 1931 году.

Нататкі дэлегата

Да набору прыйсьці падрыхтаванымі

Пазаўчора пачала сваю працу першая Ўсебеларуская конфэрэнцыя школ ФЗВ мэталюргічнай і электро-тэхнічнай прамысловасьці. Конфэрэнцыя заслухае наступныя пытаньні: — 1. Аб задачах падрыхтоўкі кадраў у 3-м і наступных гадох пяцігодкі і ролі ФЗВ; 2. Аб становішчы і задачах грамадзка-політычнага выхаваньня ў школах ФЗВ і ШУМП'ах. Сёньня мы зьмяшчаем першыя нататкі дэлегата, юнкора „Чырвонай Зьмены“ аб працы конфэрэнцыі.

У малай аудыторыі клюбу Мэталістых зьбіраліся дэлегаты. Вялікі плякат са сьцяны заклікае;—„Няхай жыве ФЗВ, які рыхтуе сьвядомых барацьбітоў за социялізм“. Па сьценах разьвешаны дыяграмы росту і становішча ФЗВ.

Без яркіх праменьняў кінітараў і нават без фотографа пачынаецца конфэрэнцыя. Прадстаўнік Бэлмэталаб'яднаньня зрабіў маленькую праверку.

Усяго на конфэрэнцыю сабралася 49 дэлегатаў.

Абралі прэзыдыум і конфэрэнцыя распачала сваю працу. З дакладам аб падрыхтоўцы кадраў у рэконструкцыйны пэрыод выступіў тав. Кліштафук.

Тав. Кліштафук адзначыў:—ФЗВ зьяўляецца асноўнай формай падрыхтоўкі кадраў, але пры Бэлмэталёаб'яднаньні толькі 5 школ ФЗВ. У першай палове 30-га году яны ахоплівалі 120 вучняў, а ў 4-ай палове 30-году—965 чалавек. Трэба ўсё-ж адзначыць, што гэты рост, хоць і вялікі, але невыстарчальны. Неабходна будзе набраць яшчэ ня меней 700 вучняў.

Далей тав. Кліштафук спыняецца на становішчы ФЗВ. Фабзавуч на заводзе „Полымя Рэволюцыі“ мае добрае памяшканьне і больш нічога. На „Чырвоным Мэталісты“ 200 чалавек, а толькі 12 карыстаюцца такарнымі варштатамі і 5 сьвідравальнымі, прычым і гэтыя варштаты непрыгодныя для працы.

Фабзавучнікі заводу „Рухавік рэволюцыі“. (Гомель) знаходзяцца ў халодным памяшканьні, без абсталяваньня. У гэтым-жа фабзавучы здумаліся фармоўшчыкамі паставіць толькі жанчын.

Далей дакладчык спыняецца на фактах галавацяпства ў будаўніцтве ФЗВ. Заводакіраўніцтва пабудавала ліцейны цэх, але ў такім месцы, што трэба зьнесьці цэлы жылы квартал.

Заводакіраўніцтва нядбайна адносіцца да ФЗВ. ФЗВ ня лічыцца заводзкім цэхам, не атрымоўвае ад завадзкіх організацый патрэбнай дапамогі.

Спыняючыся на падрыхтоўцы да новага набору, дакладчык адзначае неабходнасьць організацыі на заводах двухтыднёвіку на дапамогу ФЗВ у абсталяваньні, бо інакш з абсталяваньнем будзе надзвычайна цяжка.

Пасьля дакладу дэлегаты накіраваліся на вечар у клюб заводу „Энэргія“. Учора конфэрэнцыя заслухала садаклады гаспадарчых організацый.

Ціхон Палын.

Зьмена расьце

ыгінаючыся зьмейкамі, уцякаюць удалеч чыгуначныя рэйкі. ь блішчыць на сонцы, асьляпвязвыклыя вочы, чым прыцягвае ўвагу сьпяшаючых рабочых.

е Васька, вучань чыгуначнага завучу, ня цікавіцца гэтым і е аб іншым.

раз ён гаварыў з Груздзёвым, арам з рамонтных майстэрняў, зваў яму сваю школьную работу гайкі, балты, цыркулі.

зьдзівіўся заўсёды падвыпіў Груздзёў. Крыва ўсьміхаючыся, у Ваські гайку, павярцеў яе ыжачай руцэ, пацісьнуў плячы- , варочаючы Ваську, махнуў ю:

- Прапала цяперашняя моладзь. вытворчасьці надыходзіць. Кваліфікаваных і так мала, ды і тыя іваюць паступова з строю, а дзь... Ды што моладзь, век бу- у сваіх фабзавучах цыркулі гайкі рабіць, а да сапраўднай вы ня дойдуць.

- Няўжо-ж праўду гаворыць дзёў? Няўжо мы больш нічога ўмеем?

думаўся Васька. Не заўважыў, адышоў да яго сэкратар вучПятроў.

- Ты што, Васька, не вясёлы? бра, ядобра такім сумным ы.

Вышчырыў жэмчужныя зубы Пятроў, Ваську падняў за падбародак.

— Кінь тужыцца.

— Эх, Пятроў, бесклапотны ты хлопец! Ні аб чым ня думаеш, на працы сьмяешся, з працы ідзеш—зьмяешся.

— Ды аб чым-жа тужыць? Ці не аб тым, што мы хутка майстрамі будзем?

— Майстрамі?! А вось Груздзёў гаворыць наадварот,—уздыхнуў Васька.

— Што табе гаворыць гэты гультай цара нябеснага?

— А тое, што мы ніколі ня будзем майстрамі. Усё жыцьцё будзем гайкі ды цыркулі рабіць.

Нават сьвіснуў Пятроў, срэбным сьмехам рассыпаўся.

— Эх, ты, гурок маласольны! Ды ты ведаеш, за чым я зараз іду?

— Адкуль мне ведаць!..

— Хачу папрасіць, каб паравоз далі нам, фабзайцам, адрамантаваць.

Інструктар гаворыць, што напэўна можам узяцца за гэтую справу.

—Пятроў!..

—Ды не абы-які рамонцік, а капітальны.

— Пятроў, ты жартуеш?..

— Не жартую, падарунак к зьезду комсамолу рыхтаваць будзем.

На сваім паравозе, брат, у Маскву паедзем. Ідзі у майстэрню, там хлопцы сабраліся.

Пагаварыў Васька з Пятровым, весялей зрабілася. Ды як-жа: паравоз адрамантаваць—гэта табе ня гайкі і ня цыркуль.

Ня ідзе, а скача Васька. Яшчэ ля ўваходу ў майстэрню чуў, як хлопцы, нібы ўстрывожаныя пчолы, гулі.

— Прынамсі вынікі свае вучобы ўбачым!..

— Трэба выклікаць на соцспаборніцтва другія майстэрні...

— Ты чуў, што мы задумалі?—сустрэлі Ваську.

— Чуў. Пятроў гаварыў.

— Павел Мікалаевіч гаворыць, што мы справімся. Было-б толькі жаданьне.

Цярпліва чакалі хлопцы Пятрова. Апаска была:

— А ну, як не дадуць!

Але ўляцеўшы ў майстэрню Пятроў рассеяў усе сумненьні.

— Хлопцы крычы „ўра“—паравоз ёсьць! Заўтра прымаемся за працу.

— Урра!—грахнула на майстэрнях. І дзесяткі ног пачаліся адбіваць ад радасьці „чачотку“.

На другі дзень, сярод вакзальнага натоўпу прабіраліся па адным і парамі фабзайчыкі.

Шлях адзін—к дэпо, дзе стаяў „інвалід“ паравоз. З песьнямі, з жартамі абляпілі паравоз фабзайчыкі.

Стукаюць малаткі.

То там, то тут зьяўляецца інструктар, напраўляючы хлапцоў. Васька не адстае.

Яму далі рамантаваць тэнку.

Умела, быццам ня ў першы раз, Васька ўкручвае новыя форсункі, мяняе вінтыль. Не нарадуецца Васька на сваю работу. Ад радасьці ня вытрымаў, крыкнуў:

— Груздзёў хлусіць! Мы можам працаваць!

— Ды вось і сам прышоў паглядзець.

— Працуеце, хлопцы?

— Працуем, а ты думаў—усё жыцьце будзем гайкі рабіць?

Недаверліва паглядзеў Груздзёў.

Працуйце, толькі ня прыйдзецца-б перарабляць пасьля вас.

— Спадзяемся, ня прыйдзецца. Ну-ка, паглядзі, правільна я форсунку ўкруціў?

Нічога не сказаў. Ды на вачох відаць: прапала ў яго недаверлівасьць. Хлопцы ведаюць сваю справу.

„Інвалід“ здаровы. Ціха робіць пробныя рэйсы, выбіваючы: з ра-мон-ту.. з ра-мон-ту... з ра-мон-ту!

А на лобе паравоза блішчыць нявысахшая фарба:

„Адрамантавана сіламі фабзайцаў Саратаўскіх чыгуначных майстэрняў“.

Ф. Нісялёў.

У бой за лес

Па-баявому правядзем месячнік лесазагатовак

100-проц. выкананьне пляну лесазагатовак 1-га кварталу—парука пасьпяховага выкананьня ўсяго пляну 1931 году

Сілы і энэргію 100-тысячнай арміі комсамолу на лесазагатоўкі

Комуністычнымі мэтодамі працы,—соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам забясьпечыць выкананьне пляну лесазагатовак,—ушчэнт разаб'ем імкненьні кулацтва і яго агэнтаў опортуністых сарваць лесазагатоўкі

Лесазагатоўкі—на парадак дня ячэйкі

Улічваючы нездавальняючае становішча работы па выкананьню пляну лесазагатовак за асобны квартал 1930 году (вырубка дзелавой драўніны выканана на 133%, вырубка дроў—на 24,3%, а выказка—на 20,1%), урад БССР з 15 студзеня на 15 лютага гэтага году абвясьціў месячнік лесазагатовак.

Ударны месячнік праводзіцца пад лёзунгам „ліквідацыі прарываў асобнага кварталу 1930 гаду і 100% выкананьня програмы бягучага кварталу"—павінен забясьпечыць пасьпяховае і поўнае выкананьне пляну лесазагатовак 1931 рашаючага году.

Няма ніякай патрэбы даводзіць політычную важнасьць пасьпяховага і 100% выкананьня програмы лесазагатовак 1931 году. Вялікая вага лясной гаспадаркі ва ўсёй сыстэме нашай народнай гаспадаркі акрэсьліваецца хаця-б тым, што лес,—гэта валютны цэх нашай краіны, лес корміць нашу будаўнічую прамысловасьць, дрэваапрацоўчую і апалавую гаспадарку. Пасьпяховае выкананьне пляну лясной гаспадаркі адна з крыніц наскораньня тэмпаў індустрыялізацыі краіны і рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

У першым квартале 1931 году плянам прадугледжана загатовіць: дзелавой драўніны 2.901.360 кубамэтраў і дроў 2.932.280 кубамэтраў, вывезьці: дзелавой драўніны 5.600.720 кубамэтраў і дроў—4.210.470 кубамэтраў. 100% выкананьне гэтага пляну пакрые прарыў асобнага кварталу 1930 году і забясьпечыць 75% выкананьне пляну ў 1931 годзе.

Зусім зразумела, што выканаць плян лесазагатовак на гэты квартал мы зможам пры ўмове, калі ўсе партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя організацыі і ўся савецкая грамадзкасьць будуць актыўна змагацца за выкананьне і перавыкананьне плянаў лесазагатовак, будуць весьці бязьлітаснае змаганьне з опортуністычнай практыкай паасобных лесазагатоўчых, коопэрацыйных і савецкіх організацый, будуць бязьлітасна змагацца з кулацкімі і шкодніцкімі элемэнтамі і опортуністычнай стаўкай на самацёк у лесазагатоўках; калі камсамольскія камітэты і ячэйкі мобілізуюць энэргію і энтузіязм шырокіх мас комсамольцаў, шырока разгорнуць работу па організацыі комуністычных форм працы на лесазагатоўках—соц. спаборніцтва і ўдарніцтва. Некалькі тыдняў назад Петрыкаўская, Клімавіцкая, Капаткевіцкая, Самахвалавіцкая і інш. комсамольскія організацыі склалі ўмовы з леспрамгасам на выкананьне пляну лесазагатовак. Комсамольскія організацыі і леспрамгас узялі на сябе шэраг комкрэтных мерапрыемстваў, якія пры поўным іх ажыцьцяўленьні, забясьпечылі-б выкананьне пляну лесасагатовак, але з прычыны безадказнасьці ў выкананьні ўзятых на сябе абавязацельстваў гэтыя комсамольскія організацыі і леспрамгасы ня выканалі складзеныя між сабой умовы і не забясьпечылі 100 проц. выкананьня пляну лесазагатовак.

Ніадна з гэтых комсамольскіх організацый ня выканала свайго абавязацельства па мобілізацыі комсамольцаў на лесазагатоўкі. Няма кантролю над работай коопэрацыі, няма работы па давядзеньню плянаў загатовак і вывазкі лесу да с.-с і вёсак, не вядзецца масавая політвыхаваўчая праца сярод рабочых лесазагатовак, не разгорнута соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, як асноўны мэтад работы на лесазагатоўках.

Ударны месячнік лесазагатовак павінен унесьці рашучы пералом у работу ня толькі лесазагатоўчых профсаюзных, коопэрацыйных, але і комсамольскіх організацый.

Бязьлітасна змагаючыся з права-опортуністычнай недаацэнкай політычнага значэньня лесазагатовак, комсамольскія ячэйкі і камітэты павінны ўключыць энэргію 100-тысячнай комсамольскай арміі на выкананьне і перавыкананьне пляну лесазагатовак, падзесяцярыць тэмпы сваей работы; організаваць комсамольскія маладзёжныя брыгады рубшчыкаў і возчыкаў лесу, шырока разгарнуць работу па організацыі чырвоных абозаў з колгаснікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, давесьці пляны лесазагатовак да кулацка-заможных двароў і прымусіць іх да тэрміну выканаць заданьне; наладзіць работу сярод лесарубаў, дамагчыся, каб соц. спаборніцтва і ўдарніцтва стала асноўным мэтадам у іх рабоце, ажыцьцявіць кантроль над работай спажывецкай коопэрацыі, дапамагчы ёй перабудаваць сваю работу так, каб яна спрыяла пасьпяховаму выкананьню плянаў лесазагатовак; комсамольскія камітэты павінны праверыць, як ячэйкі выконваюць дырэктыву ЦК аб мобілізацыі 2000 комсамольцаў на лесазагатоўкі і тэрмінова выканаць яе,—вось асноўныя мерапрыемствы, якія павінны быць пакладзены ў аснову практычнай дзейнасьці ЛКСМБ на лесазагатоўках.

Далакопы соцыялістычнага спаборніцтва

Масяц таму назад чатыры вясковыя РК ЛКСМБ (Сьмілаўскі, Самахвалаўскі, Астрашыцка Гарадоцкі і Заслаўскі) склалі соцыялістычную умову на спаборніцтва з Менскім леспрамгасам, прыняўшы на сябе шэраг абавязкаў па выкананьню і перавыкананьню пляну лесазагатовак.

Аднак, ніводзін райком сваіх абавязацельстваў не выканаў. Напрыклад, РК узялі на сябе абавязак мобілізаваць на загатоўчы фронт 81 комсальца і ніводнага не мобілізавалі.

Абавязацельства організаваць на вывозцы чырвоныя абозы лесаматэр'ялаў у дзень адчыненьня X-га зьезду ЛКСМБ і сустрэць 3-га году ніў гадзі—ня выканана ніводным райкамам.

Тое-ж і з устанаўленьнем 12 пастоў „Чырвонай зьмены" (па 3 пасты ў кожным раёне).

З сваёго боку райком саюзу Дрэваапрацоўшчыкаў узяў на сябе абавязак: да 1-га чэрвеня ліквідаваць няпісьменнасьць сярод рабочых, абсталяваць чырвоны куток,—але таксама не выконвае сваёго абавязацельства.

Комсамольская організацыя Менску ніякага ўдзелу ў лесазагатоўках не прымае.

Сьмілаўскі, Самахвалаўскі, Астрашыцка-Гарадоцкі, Заслаўскі РК ЛКСМБ умову па соц. спаборніцтву з Менскім леспрамгасам паклалі пад сукно. Ажыцьцяўленьне ўмовы ня стала ў цэнтры ўвагі комсамольскай організацыі.

Паасобныя ячэйкі пытаньне аб выкананьні і перавыкананьні пляну лесазагатовак не абгаварвалі і практычнага ўдзелу ня прымалі.

Штабы лесазагатовак, створаныя пры райкомах ЛКСМБ, бязьдзейнічаюць. Нельга абысьці моўчкі і тое, што РВК ніякага ўдзелу ў лесазагатоўках не прымаюць. Напрыклад: Сьмілаўскі і Самахвалаўскі РВК прымірэнча адносяцца да кулацкай агітацыі, накіраванай на зрыў пляну. Парады да кулацка-заможных двароў не даведзены, а кулакі сабатуюць, вядуць шалёную агітацыю за зрыў пляну.

У Заслаўскім і Астрашыцка-Гарадоцкім раёнах бальшасьць сельсаветаў не абгаварвалі пляну лесазагатовак, і ў выніку—невыкананьне і поўная пагроза зрыву.

Опортуністычная стаўка на самацёк давяла да зрыву пляну загатовак РК і ячэйкі не прымаюць практычнага ўдзелу ў ажыцьцяўленьні задач месячніку лесазагатовак. Падрыхтоўка да правядзеньня месячніку, яго ход не разбудзілі ад сна Сьмілаўскі, Самахвалаўскі, Астрашыцка-Гарадоцкі і Заслаўскі райкомы.

Г.

Петрыкаўскі леспрамгас злачынна зрывае соцумову

Нядаўна Капаткевіцкі РК ЛКСМБ склаў соцыялістычную умову з Петрыкаўскім леспрамгасам і райсаюзам па ўдзелу комсамольскай організацыі рабну ў лесазагатоўках.

РК ЛКСМБ абавязаўся мобілізаваць 30 комсамольцаў на сталую працу ў лес.

Леспрамгас і спажыв. таварыства узялі на сябе абавязак забясьпечыць мобілізаваных комсамольцаў спэцвопраткай, інструмантам і г. д.

А што-ж вышла на справе?

Пакуль што ў лесе працуюць толькі 9 комсамольцаў. Астатнія невядома калі будуць мобілізаваны на работу ў лес.

Леспрамгас надбайна адносіцца да выкананьня сваіх абавязкаў перад комсамолам. Так, напрыклад, мобілізованыя 9 чалавек комсамольцаў забясьпечаны толькі харчаваньнем і халодным памяшканьнем, дзе няма ні сталаў, ні табурэткі, ні ложка, ні лямпы.

Мобілізаваныя комсамольцы сьпяць на падлозе.

Мы лічым, што такія адносіны да выкананьня соцыялістычнага спаборніцтва выпадкі злачыннымі.

Петрыкаўская РСІ павінна зараз-жа заняцца гэтай справай.

Пост „Ч. З."—ГАЙ

Гвалтаваньні жанчын, зьбіеньні да страты прытомнасьці, нявыносныя катаваньні і гвалты дэфэнзывы—

вось мэтоды ўзьдзейнічаньня разьюшанай поліцэйшчыны польскага фашызму

Пролетарыят БССР протэстуе супроць катаваньняў і зьдзекаў польскага фашызму

Ні тэрор, ні турмы, ні штыхі, ні катаваньня змогуць выратаваць фашызм ад пагібелі

Агульна-гарадзкі сход актыву МОПР'у гор. Менску выказвае сваё абурэньне і протэст супроць бесчалавечных катаваньняў, забойстваў і крывавага тэрору польскай фашысцкай дыктатуры ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі над працоўнымі масамі, якія змагаюцца за свае правы.

У той час, як працоўныя БССР і УССР, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, нябачанымі ў гісторыі тэмпамі будуюць соцыялізм, у Заходняй Беларусіі і Заходняй Украіне праводзіцца політыка разьюшанага азьвярэлага тэрору і зьдзекаў польскага фашызму над працоўнымі масамі. Зьверскімі збойствамі, тэрорам, гвалтамі і зьдзекамі над лепшымі братамі — прадстаўнікамі рабочых і сялянскіх мас, польскі фашызм ачышчае тыл для ўзброенай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Менскі гарадзкі МОПР'аўскі актыў заклікае ўсіх мопраўцаў, рабочых і працоўнае сялянства гораду і суседніх вёсак, колгасаў і савгасаў узьняць свой голас протэсту супроць крывавай оргіі польскага фашызму.

Прэч фашызм! Прэч катаў і забойцаў рабочых і працоўных сялян Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі!

У адказ на забойствы, на тэрор пілсудчыны выканаем доўг солідарнасьці перад ахвярамі фашызму—выканаем і перавыканаем нашу дапамогу па кампаніі дапамогі політвязьням.

Уключымся ва Ўсесаюзную эстафэту на дапамогу ўзмацненьню работы ў ячэйках МОПР'у.

Няхай жыве МОПР—верны памочнік барацьбітоў рэволюцыі!

Крывавыя оргіі фашысцкіх катаў

Лютасьці спадвіжнікаў высокапастаўленага фашысцкага дыктатара Пілсудзкага не паддаюцца ні чалавечай мове, ні апісаньню.

Чытаеш аб жудасьцях польскіх засьценкаў і мурашкі прабягаюць па целе ад аднаго толькі ўяўленьня:

„... Нас жудасна катавалі—выключнымі спосабамі. Мужчын білі гумовымі палкамі па палавых органах да таго, што яны ўспухалі, як дыні; яны застануцца калекамі. Нацкоўвалі сабаку, які кусаў палавыя органы мужчын. Жанчын гвалцілі. Мяне згвалцілі два разы, разьдзелі да нага потым улівалі ў нос пяцілітровыя збаны вады па дзьве-тры порцыі адразу, білі па пятках па 50—100 раз... Ніна Матуля, бачачы ўсе гэтыя жудасьці, перарэзала сабе жылы,—яна знаходзіцца ў шпіталі, у Луцку".

Словы работніцы з Луцкай турмы аб лютасьцях разюшанага фашысцкага тэрору ў Польшы,—лепшыя дакумэнты супроць буржуазнай цывілізацыі.

„... Гэта было каля 25-26 лістапада, паміж 11-12 гадзінамі ўночы... Разьдзелі да нага, вагалалі сесьці на зямлю, скавалі рукі з нагамі і праз рукі прасунулі палку... Абодва (старшы поліцэйскі наглядчык Ткачук Марыян і „Уладзя" Пастовіч) падкялі мяне, налажылі на стол і згвалцілі... А калі яны ўжодзілі, то папярэдзілі: „Даем табе 10 гадзін на разважаньне: соль будзем сыпаць на раны і г. д. Я вам проста нават апісаць не магу, якія мукі тут прыходзіцца цярпець Рута."

— Я вам проста апісаць не магу, якія мукі тут прыходзіцца цярпець—піша Рута. А хто зможа аб гэтым раскахаць? Ці ёсьць для гэтых лютасьцяй тэрмінолёгія? яны не паддаюцца ні пяру, ні чалавечай мове.

„... Допыт адбываўся наступным чынам: арыштаванаму скоўвалі рукі, клалі на пол, закладывалі рукі за калені, а пад калені прасоўвалі палку. Калі допытваны не адказваў, яго пераварачвалі на сьпіну і білі гумовай палкай па пятах, па ступнях, бёдрах. Калі і гэтым шляхам нельга было дабіцца адказу, білі кулакамі па галаве, альбо налівалі ваду праз нос. Калі гэта не памагала, білі гумовымі палкамі па палавых органах, скручвалі іх і выцягвалі. Гэтых катаваньняў ня можа вытрымаць ні адзін чалавек, хаця сярод нас ёсьць моцныя".

І ня толькі ў Луцку разбушаваўся фашысцкі тэрор, ня толькі ў Луцку разгуляліся фашысцкія зьвеэры, якіх яшчэ называюць людзьмі. У Вострава Мазавецкай турме ня лепш. Вось, што піша адтуль 17-ці гадовы кавыль Левін:

„... Шэсьць раз улівалі мне праз нос ваду, зьмешаную з газай, рот затыкалі пры гэтым анучай... У час уліваньня пастаянна білі гумовай палкай, рвалі валасы; пры частым уліваньні рвалі за палавыя органы. У гэтай інквізыцыі прымаў удзел комендант Гурскі і агент, Гурскі клікаў „Багдановічам"...

Днём 9-га лістапада мяне павезьлі ў комісарыят павятовай паліцыі, увялі ў нейкі пакой, у якім прысутнічалі Багдановіч і Гурскі, залажылі мне рукі пад калена і прасунулі паміж локцей і калені жалезны прут...

Яны садзіліся затым мне на жывот і на грудзі, рот затыкалі анучай і ўлівалі праз нос ваду... У час катаваньняў я страціў прытомнасьць".

Чаму аб гэтых жудасьцях, фактах маўчыць замежны буржуазны друк? Чаму буржуазныя борзапісцы шарахаюцца ад гэтых лютасьцяў, чаму адварачваюцца ад іх, затыкаюць вушы і не жадаюць чуць стогны ахвяр фашызму?

Замежны друк маўчыць. Аб гэтым страшна пісаць, бо ёсьць сусьветны пролетарыят, які солідарызуецца з тымі, хто стогне і паміраэ пад ботам фашызму, бо гэты сусьветны пролетарыят можа прымусіць спыніць гэтыя нечалавечыя катаваньні і зьдзекі.

— „Крывавая оргія польскага фашызму ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі шалее ва ўсю: арыштаваным забіваюць пад пазногці шпількі, уліваюць праз нос па некалькі бутэляк мачы, жанчын гвалцяць, цягаюць за валасы, б'юць па палавых органах, зьбіваюць да страты прытомнасьці.—вось мэтоды, якімі пілсудчына рыхтуе тыл на выпадак вайны з СССР".

„Зарэмба прысутнічаў пры катаваньнях і сам прымаў удзел у катаваньнях,"—піша тав. з Луцкай турмы.

Зарэмба за сваю добрую „працу" заслужанага ката атрымліваў ордэны і вышэйшыя чыны.

Рыхтуючыся да бойні, разьюшаны фашызм прымае ўсе меры і спосабы, каб падрыхтаваць сабе тыл. Тысячы працоўных кідаюцца ў турмы, там іх мучаць, дзе нечалавечна катуюцца і марчуюць да сьмерці.

Пролетарыят узьняў голас протэсту: Менск, Кіеў, Харкаў, Масква.

— Мы патрабуем спыніць зьдзекі фашысцкіх катаў!

Ніякія калецтвы, ніякія катаваньні, ні нават сьмерць ня прымусяць працоўных спыніць гэроічную барацьбу з фашызмам за сусьветную рэволюцыю.

Луцкія і Вострава-Мазавецкія катаваньні ня спыняць працоўных у змаганьні за канчатковую перамогу...

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599